**Крыўца, М.** Вярнуўся салдат дамоў… / М. Крыўца // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1988. — 28 чэрв. — С. 2.

**ВЯРНУЎСЯ САЛДАТ ДАМОЎ…**



Біяграфія Пятра Камароўскага звычайная для яго гадоў: вучоба ў школе і СПТВ-175, потым па накіраванню ваенкамата – заняткі ў марской школе ДТСААФ, якую ён закончыў з адзнакай і атрымаў пасведчанне электрамеханіка. А служыць давялося далека ад мора, далека і ад дому – пасля вучобы накіравалі ў Афганістан.

Не любіць гаварыць Пётр аб службе, страце сяброў – вайна ёсць вайна, сам некалькі разоў трапляў пад абстрэл.Яна наклала адбітак на характар. І толькі, калі паказваюць па тэлебачанню рэпартажы «адтуль», твар былога «афганца» святлее або становіцца суровым: ён бачыць тыя знаёмыя дарогі (а Пётр быў вадзіцелем), чуе аб стратах мірнага насельніцтва суседняй краіны, аб невядомым лёсе некаторых нашых салдат.

Самым шчаслівым днём лічыць Пётр 20 мая, калі выехаў на Радзіму, дамоў.

– Так спяшаўся дадому сын, – расказвае бацька Г. Б. Камароўскі. – А ў Оршы замінка: спазніўся на апошні аўтобус і поезд. Узяў таксі, хаця ў кармане ўсяго некалькі рублёў было. Аб сустрэчы – не пытайце. Самі разумееце – вярнуўся сын і брат дамоў з Афганістана. Цяпер адпачывае, а потым думае ісці працаваць шафёрам.

**М. Крыўца.**

**На здымку:** Пётр з сястрой